Ходзін, С. М. Традыцыі і перспектывы развіцця крыніцазнаўства ў Беларускім дзяржаўным універсітэце / С. М. Ходзін// Крыніцазнаўства, археаграфія, архівазнаўства ў XX—XXI ст. у Беларусі: зб. навук. артыкулаў, прысвечаных 100-годдзю з дня нараджэння М. М. Улашчыка / рэдкал. : С. М. Ходзін (адк. рэд.) [і інш.]. — Мінск: БДУ, 2007. – С. 167-171

**С. М. ХОДЗІН (Мінск)**

# ТРАДЫЦЫІ І ПЕРСПЕКТЫВЫ РАЗВІЦЦЯ КРЫНІЦАЗНАЎСТВА Ў БЕЛАРУСКІМ ДЗЯРЖАЎНЫМ УНІВЕРСІТЭЦЕ

Сучасны перыяд развіцця шмат у чым падобны на 20-я гг. XX ст., калі ішло рэальнае адраджэнне дзяржаўнасці Беларусі. Імкліва развіваліся яе эканоміка і культура. Нездарма гэтае дзесяцігоддзе называюць залатым. Тое, што Беларускі дзяржаўны універсітэт, які зараз адзначае сваё 85-годдзе, узнік у гэты час, безумоўна, садзейнічала яго хуткаму станаўленню. Ва ўсіх выпадках значны ўплыў на гэтыя працэсы аказвае асоба. Калі гаварыць пра універсітэт, то гэта найперш асоба аднаго з непасрэдных настаўнікаў Улашчыка — першага рэктара БДУ, Уладзіміра Іванавіча Пічэты. Па-першае, ён сабраў вакол сябе навукоўцаў, якія з’яўляліся асобамі з вялікай літары. Не ў меншай ступені гэта тычыцца гісторыкаў Нікольскага, Перцава і многіх іншых. Безумоўна, паміж імі і прыйшоўшымі з вясковых школ юнакамі часам прысутнічала сапраўдная бездань у падрыхтоўцы. Як адзначаў ва ўспамінах Улашчык, не было ні часу, ні магчымасцей для вывучэння замежных моў, латыні. Але ж заўсёды мелася значная частка студэнтаў, якая была апантана гісторыяй, краязнаўствам, крыніцазнаўствам, крыніцазнаўчымі пошукамі, і выкладчыкі, сапраўдныя прафесіяналы, якія садзейнічалі ў такіх пошуках. На нядаўніх канферэнцыях, якія праводзіліся гістарычным факультэтам, адзначаліся асобы Нікольскага, Перцава, Пічэты. Дарэчы, менавіта У. І. Пічэта падоўжыў класічную традыцыю і пачынаў выкладанне на першым курсе з прадмета «Уводзіны ў гісторыю».

Гэта сталая традыцыя пачалася з кнігі-падручніка Ланглуа і Сеньабоса, які так і называўся «Уводзіны ў гісторыю». Толькі ў савецкі час звычайна да назвы гэтага курса дадаткоўвалі назву рэспублікі ці краіны: «Уводзіны ў гісторыю БССР», «Уводзіны ў гісторыю СССР». Тым не менш сутнасцю гэтага курса з’яўлялася, па-першае, даволі кароткае, але глыбокае знаёмства будучых прафесіяналаў з асновамі гістарыяграфіі і крыніцазнаўства. Гэты курс аказаў вялікі ўплыў на далейшае развіццё крыніцазнаўчых пошукаў у БДУ. Дарэчы, менавіта тут, у доме № 1 Беларускага дзяржаўнага універсітэта, Пічэта гаварыў пра тое, што гісторыкі Беларусі павінны пісаць сваю гісторыю. Але пісаць яе на аснове крыніц. У сваім уводным курсе ён упершыню акрэсліў падыходы да класіфікацыі крыніц па гісторыі Беларусі, даў характарыстыку асноўных груп гэтых крыніц. Гэта ўсё аказала ўплыў на далейшае развіццё вывучэння і выкладання крыніцазнаўства ў БДУ. У. І. Пічэта быў не адзіным, хто ў 1920-я гг. далучыўся да гэтай справы.



У сярэдзіне 1920-х гг. пашанцавала ўсім студэнтам, у тым ліку М. М. Улашчыку, якім давялося вучыцца ў М. В. Доўнар-Запольскага. Гэты знакаміты вучоны прайшоў глыбокую школу папярэдняй крыніцазнаўчай працы як даследчык Метрыкі, як той, хто дасканала ведаў дакументы і імкнуўся з гэтымі дакументальнымі матэрыяламі азнаёміць студэнтаў. Асобна хацелася б падкрэсліць ролю Дз. І. Даўгялы, які з 1925 г. з’яўляўся дацэнтам БДУ. Менавіта ў 1920-я гг. падоўжылася археаграфічная праца ў Беларусі. У другой палове 1920-х — пачатку 1930-х гг. выходзяць 3 тамы «Беларускага архіва», дзе публікаваліся дакументы з розных архіўных устаноў, асабліва ў 1-м томе, Варшавы, Кракава, Санкт-Пецярбурга, Масквы. Гэта было выяўленнем новай традыцыі цікавасці грамадства да гістарычных дакументаў, гістарычнай спадчыны, крыніц. Сапраўднай кульмінацыяй гэтага працэсу стаў Першы з’езд даследчыкаў беларускай археалогіі і археаграфіі. Адзначаныя працэсы, у якіх чынны ўдзел прымалі выкладчыкі і студэнты БДУ, перадвызначылі неабходнасць асобнага курса па крыніцазнаўстве. Спачатку ён быў зацверджаны ў якасці факультатыўнага курса. Няма патрэбы зараз падрабязна спыняцца на характарыстыцы гэтага курса, паколькі дадзены аспект акрэслены ў грунтоўнай манаграфіі пра Дз. І. Даўгялу, якая падрыхтавана кандыдатам гістарычных навук, дацэнтам кафедры крыніцазнаўства М. Ф. Шумейкам[1]. Там маецца раздзел, які прысвечаны дзейнасці Дз. І. Даўгялы як дацэнта БДУ ў 1920-я гг.

Падкрэслім толькі некалькі аспектаў, звязаных з гэтым момантам. Найперш прачытанне курса «Гісторыя крыніцазнаўства Беларусі» (напачатку ён называўся «Крыніцы і крыніцазнаўства Беларусі»). Дзякуючы матэрыялам, якія былі знойдзены М.М. Улашчыкам, нам стала вядома пра гэты курс, пра яго

змест. Кароткі канспект аднаго са студэнтаў са шматлікімі арфаграфічнымі памылкамі тым не менш дае ўяўленне аб тым, што слухалі тагачасныя студэнты па крыніцазнаўстве. Заўважым, што гэты курс аказаў вельмі вялікі ўплыў на фарміраванне асобы, навуковых падыходаў у далейшым М. Улашчыка і іншых яго калег, паплечнікаў, студэнтаў тагачаснага Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

Удзел Дз. І. Даўгялы ў крыніцазнаўчых распрацоўках быў звязаны не толькі з прачытаннем гэтага курса. У большасці дыпломныя працы, тыя даручэнні, якія даваліся студэнтам ад яго імя, насілі характар крыніцазнаўчых пошукаў. Менавіта Даўгялам былі закладзены першыя спробы падзелу гэтага курса на 2 часткі: тэарэтычную, дзе вызначаліся аспекты зместу, сутнасці гэтага прадмета, класіфікацыя крыніц, і практычную, якая звязана з характарыстыкай асноўных груп крыніц. Дарэчы, значная частка была звязана з характарыстыкай матэрыяльных крыніц. Гэта дало пачатак сталай традыцыі наладжвання сістэмы археалагічных пошукаў у БДУ. Я не буду падрабязна спыняцца на тых, хто



быў звязаны з пошукам археалагічных крыніц, але ў пасляваенны перыяд гэта ўжо асобная кафедра гістарычнага факультэта БДУ. Безумоўна, што важнае места ў гэтым курсе займала характарыстыка пісьмовых крыніц, найбольш важных, па меркаванні Даўгялы, і даступных тагачасным гісторыкам. У сваіх лекцыях Даўгяла даваў і характарыстыку публікацый, якія былі вядомы на гэты час, і характарыстыку тых архіўных устаноў, з якімі маглі сутыкнуцца студэнты. Дарэчы, работа Даўгялы ў БДУ працягвалася не вельмі доўга. Ужо ў 1927/28 навучальным годзе курс крыніцазнаўства быў злучаны з курсам айчыннай гісторыі. Гэта яшчэ раз паказвае, што пакуль жыве крыніцазнаўства, у значнай ступені прысутнічае гісторыя як навука.

У 1929 г. Мікалай Улашчык закончыў БДУ. У сваіх успамінах ён падкрэслівае, што 1929 г. для выпускнікоў універсітэта быў вельмі сумным. Ён піша: «Мы выходзілі з універсітэта і апынуліся на раздарожжы. Увесь час, як памяталі сябе, мы ўсё вучыліся. Усё іншае было дадаткам да вучэння. А тут выпуск. Больш спяшацца на лекцыі, пісаць даклады не трэба. З’яўляецца вольны час. Жыць па-чыноўніцку не хацелася»[2].

Наступны перыяд у цэлым вельмі складаны і для нашай гісторыі, і для гісторыі БДУ. Даволі часта мы гаворым пра тое, што ўсё выносіцца на суд гісторыі. Толькі мы не павінны спяшацца стаць суддзямі.

Адным з прадаўжальнікаў выдатнай традыцыі крыніцазнаўства і археаграфіі ў складаныя 1930-я гг. стаў акадэмік Васіль Карпавіч Шчарбакоў. Воляй лёсу і кампартыі менавіта ён узначаліў створаны ў 1934 г. гістарычны факультэт БДУ. Не маючы грунтоўнай гістарычнай адукацыі, В. К. Шчарбакоў выявіў сябе як выдатны арганізатар гістарычнай навукі. Менавіта пад яго кіраўніцтвам былі падрыхтаваны два тамы «Нарысаў па гісторыі Беларусі», але частка другая з іх так і не ўбачыла свет, паколькі была затрымана ў друку. Бачыць і вывучаць гісторыю праз крыніцы — вось галоўны імператыў гэтага выдання. На жаль, і сам В. К. Шчарбакоў таксама пацярпеў ад рэпрэсій, ён пражыў крыху больш за 40 гадоў.

Рэпрэсіі, вайна перарвалі тую класічную традыцыю, якая толькі пачынала складацца на Беларусі, традыцыю павагі да крыніц, вывучэння крыніц не толькі для ілюстрацыі сваіх даследаванняў, але і дзеля глыбокіх тэарэтычных пошукаў і абагульненняў. Разам з тым нельга сказаць, што прыпынілася сур’ёзная даследчыцкая і публікацыйная дзейнасць гісторыкаў на Беларусі і ў БДУ. У гэтым накірунку найперш патрэбна адзначыць асобу Лаўрэнція Сямёнавіча Абэцэдарскага. У многіх постсавецкіх публікацыях некаторыя аўтары адзначалі яго як адыёзную постаць, што быццам бы кардынальна стрымлівала развіццё гістарычнай адукацыі і навукі на Беларусі. Не імкнучыся ўзняць зараз вакол гэтага пэўную дыскусію, пазначым, што гэты чалавек са складаным характарам і



сапраўды супярэчлівы вучоны тым не менш адрадзіў кафедру гісторыі Беларусі і адстойваў выкладанне гісторыі на беларускай мове. Вялікае значэнне надаваў ён таксама вывучэнню і папулярызацыі крыніц па гісторыі Беларусі.

Сярод падрыхтаваных выданняў найперш адзначым «Русско-белорусские связи». Нягледзячы на невысокі археаграфічны ўзровень, на што справядліва звяртаў увагу М. М. Улашчык, гэтая публікацыя ўнесла важкі ўклад у вывучэнне складаных узаемаадносін Рэчы Паспалітай і Маскоўскай дзяржавы XVII ст. і ролі беларусаў у фарміраванне тых культурных каштоўнасцей, якімі і па сённяшні дзень ганарыцца Расія.

Нават тыя гісторыкі, якія прызначалі Л. С. Абэцэдарскаму не самыя лепшыя эпітэты, часам шчыльна цытавалі яго публікацыі ў сваіх артыкулах.

Асобна патрэбна падкрэсліць ролю прафесара, доктара гістарычных навук А. П. Ігнаценкі. Чалавек — складаны па характару, ён быў дасціпным гісторыкам, які выдатна ведаў крыніцы і не ўспрымаў павярхоўнасці і тэарэтызавання. Па кожным перыядзе А. П. Ігнаценка меў вялікую папку «вопісаў» крыніц, а чытаць яму прыходзілася даволі розныя аспекты гісторыі Беларусі. З 1978 г. Аляксандрам Пятровічам чытаўся спецкурс па крыніцазнаўстве гісторыі Беларусі, які ўключаў знаёмства з важнейшымі комплексамі крыніц, як архіўных, так і апублікаваных. Нягледзячы на розніцу ў падыходах да ацэнкі асобных падзей гісторыі Беларусі, М. М. Улашчык і А. П. Ігнаценка ўзаемна, як вучоныя, высока ацэньвалі адзін аднаго. А. П. Ігнаценка заўсёды прыводзіў у прыклад аналізу крыніц па дысертацыі навуковую працу М. М. Улашчыка «Предпосылки отмены крепостного права в Литве и Западной Белоруссии», а М.М. Улашчык у прыватных размовах сведчыў аб выдатным выданні крыніц А. П. Ігнаценкам. Безумоўна, спецкурс па крыніцазнаўстве гісторыі Беларусі ў значнай ступені з'яўляўся факталагічным, але ён прымушаў студэнтаў уважліва вывучаць, ведаць крыніцы па гісторыі Беларусі. Патрэбна адзначыць таксама ролю тых вучоных на факультэце, якія хоць і не займаліся аспектамі менавіта крыніцазнаўства, але свае даследаванні будавалі на дакладна вызначанай крыніцазнаўчай аснове: акадэмікаў М. М. Нікольскага, У. М. Перцава, Л. М. Шнеерсона[3].

Класічныя традыцыі, закладзеныя У. І. Пічэтам, шмат у чым падтрымліваліся дзякуючы запрошаным з іншых універсітэтаў спецыялістам. Дапамагалі кансультацыямі і запрашаліся для прачытання лекцый такія вядомыя вучоныя, як У. В. Маўродзін, Г. М. Панкратава, Б. Д. Грэкаў. Вялікае значэнне для справы развіцця крыніцазнаўства ў БДУ мела запрашэнне ўзначаліць кафедру гісторыі СССР дасавецкага перыяду вядомаму ўжо на той час прафесару Горкаўскага універсітэта (сучасны Ніжні Ноўгарад) І. В. Аржахоўскаму.



Новы этап развіцця крыніцазнаўчых даследаванняў звязаны з кафедрай крыніцазнаўства БДУ. Яе стваральнікам з'яўляецца У. Н. Сідарцоў, які завяршаў сваё навучанне ў аспірантуры Ленінградскага (зараз Санкт-Пецярбургскага) універсітэта[4]. У 1982 г., дзякуючы намаганням яго і тагачаснага дэкана гістарычнага факультэта БДУ П. А. Шупляка, адкрываюцца аддзяленні музеязнаўства і архівазнаўства. На кафедры пачынаюць канцэнтравацца вядомыя спецыялісты ў галіне архівазнаўства, крыніцазнаўства, музеязнаўства, гістарычнай інфарматыкі. На мяжы XX і XXI ст. вызначылася і заявіла аб сабе навуковая школа па метадалогіі гісторыі. У апошнія гады абаронена некалькі дысертацый па крыніцазнаўстве. Заснаваны і ўбачылі свет першыя тры выпускі штогодніка «Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны». Адпрацаваны структура і суадносіны курсаў па крыніцазнаўстве, якія былі прапанаваны ў 1998 г.[5] Пачынаецца вывучэнне крыніцазнаўства з невялікага тэарэтычнага ўступу, маючага для гісторыкаў характар уводзінаў у спецыяльнасць. На другім курсе чытаецца «Крыніцазнаўства гісторыі Беларусі», дзе студэнты вучацца на аснове вядомых ім фактаў праводзіць класіфікацыю і прымяняць веды і навыкі вывучэння асобных груп крыніц, атрыманыя падчас тэарэтычнага навучання. На трэцім курсе пачынаецца спецыялізацыя па кафедрах, дзе адбываецца паглыбленне ведаў у дадзеным накірунку праз прачытанне спецкурсаў па крыніцазнаўстве. І ўрэшце падагульняючае крыніцазнаўчае, як і гістарыяграфічнае, вывучэнне адбываецца на 4—5 курсах праз метадалогію гісторыі. Падрыхтаваны новыя стандарты і тыпавыя планы, якія замацоўваюць такую структуру крыніцазнаўчага вывучэння. Створаны першыя падручнікі, праведзены шматлікія канферэнцыі. Узраслі патрабаванні да дысертацыйных даследаванняў. Усё гэта дазваляе спадзявацца, што традыцыі, закладзеныя У. І. Пічэтам і працягнутыя М. М. Улашчыкам, будуць паспяхова падоўжаны.

---

[1] Шумейко М. Ф. Архивист и археограф Дмитрий Иванович Довгялло. Минск: БЕЛНИИДАД, 2002. 165 с.

[2] Улашчык Мікалай. Выбранае. Мінск: Беларускі кнігазбор, 2001. С. 228.

[3] Гістарычны факультэт. Да 70-годдзя заснавання / Адк. рэд. С. М. Ходзін. Мінск: БДУ, 2004. 223 с.; іл.

[4] Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны. Вып. 1 / Адк. рэд. С.М. Ходзін. Мінск: БДУ, 2002. 254 с.

[5] Гістарычныя крыніцы: праблемы класіфікацыі, вывучэння і выкладання. Матэрыялы да міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 120-годдзю з дня нараджэння У. І. Пічэты. Мінск: Белдзяржуніверсітэт, 1998. 209 с.